### Литература и источники

1. Вонсович, Л. В. Взаимодействие учреждений образования и церкви как основа духовно-нравственного воспитания личности / Л. В. Вонсович // Православные христианские ценности и духовно-нравственные константы: потенциал диалога в полиэтническом и поликонфессиональном пространстве: сборник материалов Всероссийской научно-практической конференции с международным участим и VIII Региональных Рождественских образовательных чтений «Молодежь: свобода и ответственность» (4 ноября – 14 декабря 2018 г.) / под ред. В.В. Андреева, Д.Н. Нестеренко. – Чебоксары: ООО «Издательский дом «Пегас», 2019.

2. Вонсович, Л. В. Роль христианских ценностей в духовно-нравственном воспитании личности / Л. В. Вонсович // Религия и общество – 13 : сборник научных статей / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2019.

3. Кирилл Туровский. Притча о человеческой душе и теле / Кирилл Туровский // Златоструй. Древняя Русь X–XIII вв. – М.: Молодая гвардия, 1990.

4. Феодосий Печерский. Слово о терпении и любви / Феодосий Печерский // Златоструй. Древняя Русь X–XIII вв. – М.: Молодая гвардия, 1990.

## НААЛАГІЧНАЯ МЕТОДЫКА А. Г. ДУГІНА Ў АДНОСІНАХ ДА БЕЛАРУСІ

*А. А. Ражкоў*
*(Мінск, Беларусь)*

А. Г. Дугін у сваім шматтомніку «Наамахія – бітвы розуму» прыводзіць сваю «наалагічную» методыку даследвання этнасаў, якая

базуецца на «сацыялогіі ўяўлення Ж. Дзюрана». Карыстаючыся гэтай методыкай А. Г. Дугін закрануў таксама і Беларусь, праводзячы даследванне гістарыяла (імажэнера) беларускага народу. Дадзены артыкул прадэманструе погляды А. Г. Дугіна на беларускі гістарыял, а таксама высветліць чаргу памылак, якія зрабіў А. Г. Дугін пры сваім даследванні.

Перш чым разглядаць погляды А. Г. Дугіна на гістарыял беларусі, трэба спачатку разглядзець яго тэрміналагічны апарат і яго метадалогію. А метадалогія А. Г. Дугіна, як было адзначана вышэй, базуецца на «сацыялогіі ўяўлення» Ж. Дзюрана [10]. Сутнасць канцэпта такая: першапачатковым з'яўляецца ўяўленне чалавека (як працэс); у сваю чаргу ўяўленне спачатку фармуе самога ўяўляючага індывідуума, а толькі пасля тое, што ўяўляецца. У сваю чаргу сістэма ўяўлення-уяўляючага-уяўляемага фармуе імажэнер. Аднак змест імажэнера складаюць тры асноўных рэфлекса і вынікаючыя з іх рэжымы, якія фармуюцца ў дзяцінстве ў соцыуме, а менавіта – пастуральны, нутрытыўны/дыгестыўны, капулятыўны. З дадзенымі рэфлексамі звязаны рэжымы імажэнера (прыведзены ў таблічцы, у Дугіна маюць назву «Логасы»), і кожны з рэфлексаў мае свой набор рэлігійных міфаў з ім звязаны. І сукупнасць гэтых міфаў (г. з. розных працэнтных адносін гэтых рэфлексаў) фармуе змест імажэнера. Імажэнер у межах народа мае назву гістарыял. Соцыум па Дугіну з'яўляецца праекцыяй свайго Логаса. Патрэбна дадаць тое, што гэтую методыку ён таксама звязвае з сваімі рэлігійнымі поглядамі (якія з'яўляюцца больш неаплатанічнымі, як выстветлілася ў іншым артыкуле аўтара дадзенага паведамлення [15]) – Тройца па Дугіну з'яўляецца «сусветным імажэнерам» – Адзінае (уяўляючы), Розум (уяўленне) і Душа (уяўляемае) [9].

**Табліца 1**
**Характарыстыка імажэнераў і іх рэжымаў па Ж. Дзюрану і А. Дугіну**

| Рэфлекс | Характарыстыка Рэфлекса | Рэжым Імажэнера | Логас па Дугіну | Характарыстыка Логаса | Сымбалі |
|---|---|---|---|---|---|
| Пастуральны | Звязаны з уставаннем немаўля ў вертыкальным становішчы. З›яўленне страху падзення і жадання «вырасці» (стаць вышэй). | «Дыўрн» (Дзённы) | Апалон | «Мужчынскі» Логас, «Гераічны», арыентаваны на арыстакратыю, Звязаны з падзелам на «высокае» і «нізкае», накіраванасць «ўверх». Прынцыповая эксклюзіўнасць, кантрадыкцыя, упор на асабістасць. Супраціў смерці і часу (як ворагам ўяўлення). Супраціў свету. Жывёльны негатывізм. | Меч, дзіда, скіпетр, сонца, арол і г.д. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Нутры-тыўны/ Дыгес-тыўны | Звязаны з пачуццём голаду і харчаваннем немаўля (перапрацоўкай чагосьці вонкавага у «сваё»). | «Містычны Накцюрн» | Кібела | «Жаночы» Логас, «Цёмны» Логас, «Матчын» Логас. Эфіміўзуе з›явы, якія для Апалона з›яўляюцца благімі. Жывёльны пазітывізм. Арыенцір на матэрыю. Ліліпутызацыя Апаланічнага. Трансгрэсія ў бок смерці. Цяга да «ўсёадзінства» ( «размазвання» ідэнтычнасці і аб›ектаў). Свет - дом. Арыенцір на жрэцтва. | Чаша, Магіла, Калыска, Яйка, куфар і т. Д. |
| Капуля-тыўны | Звязаны з імкненнем да савакуплення і асалоды (як рытмічны і цыклічны акт). | «Драма-тычны/ сінтэтычны Накцюрн» | Дыяніс | Сінтэз Жыцця і Смерці. Раздваенне і сэксуалізацыя ідэнтычнасці. Цыклічнасць як натуральны стан. Прагрэсівізм і рэграсівізм. Эратызм. Стабільнасць. Андрагін. Арыенцір на сялянства. | Крыж, Круг, Кола, Дрэва, Свастыка і г. д. |

Таксама да гэтай схемы магчыма дадаць «Формулу Рускага Сацыягенэза» А. Г. Дугіна, якая гучыць так: Этнічнае Ядро (канстанта) і этнічныя мешасці (пераменая) складваюцца ў народ (канстанта); народ фармуе дзяржаву (пераменая), дзяржава стварае цывілізацыю (канстанта), а цывілізацыя стварае грамадства (пераменая) [14]. Разумела, што носьбітам Логаса па Дугіну з'яўляюцца канстанты. Дугін падкрэслівае тое, што гэтая формула можа і не працаваць у іншых супольнасцях, але сам факт таго, што Дугін залічвае беларусаў у склад «рускага народу» стварае чаргу пытанняў. Таму і ўяўляецца патрэбным высветліць – а ці сапраўды беларусы з'яўляюцца толькі «балтыйскай ідэаварыяцыяй рускага народу»?

Тлумачэнне сваёй гіпотэзы на аснове наалагічнай методыцы А. Г. Дугін апісвае ў «Ноомахии. Русский Логос 2», абапіраючыся на гістарычныя працы еўразійца Г. В. Вярнадскага [13]. Адразу патрэбна адзначыць некалькі тэзісаў Вярнадскага, якія Дугін апісвае ў сваёй кнізе, але якія з'яўляюцца спрэчнымі з пункту гледжання гісторыі і лінгвістыкі.

1. «Усходнія славяне знаходзіліся пад уплывам іранскіх качэўнікаў (якія з'яўляліся палітычнай элітай славян!) і менавіта праз іх атрымалі іранскую версію Логаса Апалона. Аб гэтым сведчыць існаванне тытула Кагана на Русі, назва Русь паходзіць ад Грэцкага Ρώς, што з'яўляецца скажэннем назвы Раксаланаў, а фрыкатыўны гук «г» з'яўляецца «спадчыннай скіфа-сармацкай эліты». Назвы багоў «Хорс» і «Сямаргл» – запазычванні ў Іранцаў».

Адразу трэба адзначыць, што назва «Русь» па сведкам і летапісным (Аповесць мінулых часоў [4]), і дакументальным (Бяртынскія Аналы [3]) з'яўляецца скандынаўскай, аб чым сведчыў з пункту лінгвістыцы А. А. Залізняк [8]. Бяртынскія Аналы з'яўляюцца сведчаннем аб тым, што тытул Кагана не быў звязаны менавіта з плямёнамі ўсходу, а, хутчэй за ўсё, быў запазычаны [3]. Слова «Ρώς» ужывае ў адносінах да русінаў патрыярх Фоцій, а яно сустракаецца ў кнізе прарока Езэкііля

(у арыгінальным варыянце вымаўляецца як «Рош»; грэкі не вымаўлялі гук «ш») і ён звязаны з эсхаталагічнымі ўяўленнямі праваслаўных грэкаў у адносінах да русінаў (па спажыванню гэтага тэрміна патрыярхам Фоціем), але ніяк не з раксаланамі [5]. Фрыкатыўны гук «г» не можа ніяк быць запазычаным, бо каб запазычыць гук у іншага народу патрэбна каб народ славян валодаў двума мовамі адначасова, чаго не магло быць т. я. запазычванні з іранскіх моў – мінімальныя. Фрыкатыўны гук «г» з'яўляецца прадуктам страты затвора афрыкатаў і спірынтызацыя гука Г адбылася толькі ў часы асобных славянскіх моваў, бо большай частка з іх захоўвае «г» выбухное, якое было ў праславянскай мове [11]. Назвы багоў пантэона Ўладзіміра таксама не з'яўляюцца іранскімі запазычваннямі: Сямаргл, па меркаванню А. С. Фаміцына пад Сямарглам маецца наўвазе «СѢм Ерыла» (т. я. у «Словы нейкага хрысталюбца і змагара па правай веры» ёсць цытата «Веруют в Сима и Ерьгла», а літары «ь» і «г» з'яўляюцца памылкай і там павінна быць літара «ы») [7]. Што тычыцца Хорса, то Канстантын Барысаў кажа, што Хорс слова мае славянскае пахожданне, а варыянт іранскага паходжання з'яўляецца недарэчным (Як сцвярджаў М. Фасмер – «тут прысутнічаюць фанітычныя цяжкасці») [2]. Гістарычна абумоўлена гэта тым, што ў часы імперыі Сасанідаў Сонца было ўжо дэсакралізавана. А само слова Хорс звязана з славянскім «хороший», а тое звязана ўжо непасрэдна з словам мовы вед - hṛṣu, якое мае сэнс «шчаслівы, узбуджаны» і звязана з богам Агні. Таксама аб гэтым сведчаць паралелі з мовай грэкаў і фракійцаў (дзеяўслоў «χαιρω» і імя Рэзас), якія фармуюць агулам архетып салярнага бога-героя. Таксама патрэбна дадаць тое, што па дадзеным генэтыцы і археалогіі магчыма высветліць тое, што качэўнікі-іранцы і славяне былі не больш, чым суседзі, але развіваліся этнасы самастойна [12].

2. «Беларусы з'яўляюцца ідэяварыяцыяй агульнарускага народу, але з сваімі асаблівасцямі т.я. асноўным субстратам беларусаў з'яўляліся славяне і таму яны таксама з'яўляюцца арыентаванымі на

Туранскі (Еўразійскі) Логас».

Калі абвяржэнне наяўнасці іранскага Логасу (частцы Логаса Турана) ў славян было агучана вышэй, то патрэбна дадаць тое, што беларусы не былі звязаны з ім і пазней, бо яго носьбіты па Дугіну (Манголы і Фіна-Угры) не ўплывалі значна на Беларусь (фіна-ўграў не было, а манголы не дайшлі, таму і русь «белая»). Патрэбна таксама дадаць тое, што па меркаванню Валянціна Сядова, Л. В. Аляксеява беларусы не з’яўляюцца славянамі т.я. асноўны іх субстрат з’яўляецца балтыйскім [6; 16; 17]. Дзеля справядлівасці патрэбна адзначыць тое, што і сам А. Г. Дугін кажа пра асабістасць беларускага «Логасу», яго накіраванасці на захад, але лічачы яго часткай рускага [13]. Як мы бачым, такое сцвярджэнне не можа быць ісцінай па прычынам, агучаным вышэй.

Такім чынам магчыма казаць тое, што, не гледзячы на цікавасць методыцы А. Г. Дугіна, патрэбна таксама ўлічваць і дадзеныя іншых навук і іншыя методыцы каб прыйсці да максімальна аб’ектыўнага выніку даследванняў, інакш мы можам сутыкацца з памылкамі, якія могуць прывесці людзей да памылковых і часам дыструктыўных ідэй.

**Літаратура і крыніцы**

1. Библия. Книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета. – 4-е изд. – Брюссель: Жизнь с Богом, 1989. – 2535 с.

2. Borisoff C. L. Non-Iranian origin of the Eastern-Slavonic god Xŭrsŭ/ Xors / C. Borisoff // Studia Mythologica Slavica – 2014. – №17 – С. 9-36.

3. Google book’s. Monumenta Germaniae historica inde ab anno Christi quingentesimo usque ad annum millesimum et quingentesimum [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://books.google.ru/books?id=H-QCgb_epqMC&dq=Venerunt+etiam+legati+Grecorum+a+Theophilo+imperatore+directi,+Theodosius+videlicet+Calcedonensis+metropolitanus+episcopus&hl=ru&source=gbs_navlinks_s – Дата досту-

па: 10.09.2019

4. Lib.ru. Повесть временных лет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.lib.ru/HISTORY/RUSSIA/povest.txt_with-big-pictures.html – Дата доступа: 10.09.2019

5. Medium. К вопросу о происхождении слова ‘Ρώς, ‘Ρωσία, Россия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://medium.com/@Phanariot – Дата доступа: 25.05.2017

6. Алексеев, Л. В. Полоцкая земля в IX – XIII вв. (Очерки истории Северной Белоруссии) / Л. В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 295

7. Библиотека svitk.tu. Ишутин Александр Александрович – Восточнославянские боги и их имена [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://svitk.ru/004_book_book/14b/3255_ihutin-vostohnoslavyanskie_bogi_i_ih_imena.php – Дата доступа: 23.09.2019

8. Видеохостинг Youtube. Андрей Зализняк: история русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=5Nuiw73EY50&feature=youtu.be&t=374 – Дата доступа: 1.07.2014

9. Видеохостинг Youtube. Презентация «Ноомахии». т. 1. Софрониева Пустынь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=NzW0MRtAJT0&list= – Дата доступа: 04.05.2014

10. Видеохостинг Youtube. Социология воображения. Александр Дугин [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=FToaX6pVDvQ – Дата доступа: 26.03.2013

11. Википедия – свободная энциклопедия. Обсуждение: праславянский язык [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki – Дата доступа: 10.09.2019

12. Википедия – свободная энциклопедия. Этногенез славян [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki – Дата доступа: 10.09.2019

13. Дугин А. Г. Ноомахия: войны ума. Русский Логос II. Русский

ториал. Народ и государство в поисках субъекта. – М.: Академический проект, 2019. – 959 с.

14. Дугин А. Структура русского социогенеза / А. Дугин // Социогенетические и политэкономические корни России как общества, страны, государства – 2009. – №4 – С. 7-25.

15. Ражкоў А.А. Праваслаўе і праваслаўная традыцыя ў філасофска-рэлігійных творах А.Г. Дугіна / А.А. Ражкоў // Юбилейные XXV Международные Кирилло – Мефодиевские Чтения «Наследие святых Кирилла и Мефодия в мировой духовной культуре». Минск, 30–31 мая 2019 / Сборник докладов Юбилейные XXV Международные Кирилло – Мефодиевские Чтения «Наследие святых Кирилла и Мефодия в мировой духовной культуре» (Артыкул знаходзіцца ў друку)

16. Седов, В. Белорусы – это ославяненные балты / В. Седов // газ. Літаратура і Мастацтва – 1993. – 23 апреля. – С. 16.

17. Седов В. В. Восточные славяне в VI-XIII вв. / Серия: Археология СССР. М.: 1982. 328 с.

# ЗАБРОШЕННЫЕ ПРАВОСЛАВНЫЕ СВЯТЫНИ БЕЛАРУСИ: СОСТОЯНИЕ, ПЕРСПЕКТИВЫ, ДЕЙСТВИЯ

*Д. Н. Пинчук*
*(Минск, Беларусь)*

Практически в каждой стране мира есть заброшенные здания, имеющую для каждого конкретного региона определенную культурную ценность. Несмотря на их плачевное состояние величественные силуэты до сих пор внушают определенный спектр эмоций при соприкосновении от понимания того, что это наша история, здесь кипела жизнь, и свидетелем этого было не одно поколение, до приятия не-